## ЛІТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

**УДК821.161.3.09-1«20»**

**Бараноўскі Аляксандр Аляксандравіч**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык аддзела беларускай літаратуры
XX і XXI стст. Цэнтра даследаванняў
беларускай культуры, мовы і літаратуры
НАН Беларусі
г. Мінск, Беларусь

**Aliaksandr Baranouski**
PhD in Philology, Associate Professor,
Head of the Department
of Belarusian Literature of the 20th
and 21st Centuries of the Center
for Research of Belarusian Culture,
Language and Literature
National Academy of Sciences of Belarus
Minsk, Belarus
baranouski.ales@gmail.com

# ДЫДАКТЫЗМ І ВЫХАВАННЕ Ў СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ ПЕРЫЁДЫЦЫ БЕЛАРУСІ: АД ПАЭТЫЧНАГА АМАТАРСТВА ДА ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ

# DIDACTICISM AND EDUCATION IN THE MODERN LITERARY PERIOD OF BELARUS: FROM POETIC AMATEURISM TO PROFESSIONALISM

У артыкуле аналізуецца дыдактычна-выхаваўчая роля літаратурна-мастацкай перыёдыкі ў фарміраванні творчага шляху пачынаючых аўтараў. Асаблівая ўвага надаецца пераходу ад аматарскага ўзроўню да прафесійнай літаратурнай дзейнасці, а таксама захаванню і трансляцыі традыцый як адметнага фактару, што ўплывае на развіццё сучаснай беларускай літаратуры.

К л ю ч а в ы я  с л о в ы: *маладая паэзія Беларусі*; *перыёдыка*; *сучасная беларуская паэзія*; *літаратурная генерацыя*; *традыцыя*; *дыдактызм*.

The article analyzes the didactic and educational role of literary and artistic periodicals in shaping the creative path of novice authors. Special attention is paid to the transition from amateur to professional literary activity, as well as the preservation and transmission of traditions as a distinctive factor influencing the development of modern Belarusian literature.

K e y  w o r d s: *young poetry of Belarus*; *periodicals*; *modern Belarusian poetry*; *literary generation*; *tradition*; *didacticism*.

Ці застаецца паэзія XXI стагоддзя сродкам выхавання грамадства? Як яе дыдактычныя магчымасці карэлююць з аксіялагічнай шкалой маладых аўтараў? Дзе пачынаючым літаратарам заявіць пра сябе і не стаць “у рожкі

са старымі”, захаваўшы самасць? Чым забяспечана пераемнасць традыцый сёння? Што патрэбна маладой паэзіі, каб творчы парыў стаў творчым прарывам? Згаданыя пытанні ў многім вызначаюць сучасную літаратуру – у яе дынаміцы і рэфлексіі.

Прыгожае пісьменства, як вядома, звязвае часы і пакаленні, захоўвае, перадае назапашаны досвед чалавецтва, натхняе, захапляе, навучае, перасцерагае, выхоўвае. Паэзія як аператыўны спосаб рэагавання на зменлівую рэчаіснасць стымулюе сацыяльную эмпатыю, абмяжоўваючыся тым не менш наяўнымі чытацкімі каштоўнасцямі – духоўнымі, этычнымі, эстэтычнымі. Выхаванне дзяцей адбываецца заўсёды, нават калі бацькоў няма дома, – гаварыў А. С. Макаранка [1]. І ў гэтым сэнсе ўздзеянне пісьменніка на фарміраванне асобы (як вынік – нацыі) праз твор – адно з самых моцных.

Рэцыпіент часцей успрымае мастацкі тэкст з пункту гледжання задавальнення, а не жадання разабраць яго на складовыя элементы (так званая “наіўная” чытацкая стратэгія). Чым меншая эстэтычная дыстанцыя паміж творам і публікай, тым вышэй ступень эмацыянальнай уцягнутасці індывіда ў працэс яго спасціжэння. Але гэта базавы патэнцыял любога віду мастацтва. Што да яго канкрэтнага ўвасаблення, то паэзія з ранняга дзяцінства ўзбагачае вобразнае мысленне і маўленне чалавека, практыкуе яго паэтычны слых, наладжвае пачуццё рытму, такта, тэмбру, тэмпу, інтанацыі, а галоўнае, пры дапамозе адпаведных сродкаў выразнасці ў дасціпнай форме раскрывае глыбокія маральна-этычныя і выхаваўчыя ідэі. Рытмічныя канструкцыі, яркія запамінальныя метафары развіваюць уменне бачыць свет праз прызму сімвалаў і асацыяцый. Асабліва важна, каб паэзія рабіла гэта ненавязліва, паляпшаючы ўспрыняцце і разуменне складаных тэм.

Гаворачы пра ступень уплыву сучаснай беларускай паэзіі на духоўнае выхаванне грамадства, мы невыпадкова пачынаем з літаратуры для падрастаючага пакалення, якая адрасавана дзецям, але выбіраюць яе для дзяцей бацькі (Уільям Годвін). Лавіруючы паміж самавыяўленнем і патрэбай навучыць, выхаваць, накіраваць, многія айчынныя аўтары працуюць для розных узроставых катэгорый. Так было і з класікамі прыгожага пісьменства Эдзі Агняцвет, Петрусём Броўкам, Васілём Віткам, Кандратам Крапівой, Паўлюком Пранузам і інш. Да іх творчасці звяртаюцца пастаянна. А што важней – іх справу працягваюць праз дзесяцігоддзі. Сённяшняму маленькаму чытачу знаёмыя імёны Алеся Бадака, Раісы Баравіковай, Ірыны

Бутарынай, Анатоля Зэкава, Ніны Галіноўскай, Казіміра Камейшы, Уладзіміра Мазго, Міколы Маляўкі, Міколы Мятліцкага, Міхася Пазнякова, Іны Фраловай, Міколы Чарняўскага, Міколы Шабовіча, Віктара Шніпа і інш.

Паэзія, арыентаваная на падрастаючае пакаленне, і творчасць маладых аўтараў фарміруюць узаемадапаўняльны культурны дыялог. "Беларусь", "Родная мова", "Дзякуй", "Кім быць?", "Наш род", "Дзед і ўнук", "Мама маёй маці", "Жадаю жыць у міры", "Адкрый для сябе" – творы на злабадзённыя тэмы са старонак літаратурна-мастацкага часопіса для дзяцей малодшага школьнага ўзросту  – "Вясёлка". Вершы, прызначаныя згаданай узроставай групе, не толькі па сутнасці, але і па форме асаблівыя – накіраваны, напрыклад, на развіццё арфаэпічных здольнасцей (скорагаворкі, лічылкі, "легкамоўкі" і інш.). Іх напісанне патрабуе ад аўтараў філалагічнай і педагагічнай падрыхтоўкі.

Паколькі навучанне і выхаванне прыкладамі, сыходзяцца ў думцы педагогі (Г. Драйдэн, Дж. Вос, Л. С. Выгоцкі, Я. Корчак і інш.), маюць большы вынік, чым патрабаванні і прамыя ўказанні, паэзія становіцца ідэальным інструментам для рэалізацыі шэрагу задач: назіранне і пераймание, эмацыянальны водгук, актывізацыя крытычнага і вобразнага мыслення, педагогіка даверу. Згаданых арыенціраў, напрыклад, трымаюцца метадысты пры распрацоўцы школьных падручнікаў: правілы ў іх заўжды чаргуюцца з ілюстрацыйнымі элементамі.

Мастацкая кніга як звод маральных законаў і правіл таксама рэтранслюе адпаведныя ўзоры – эксплицытна (прамая дыдактыка) альбо імпліцытна (праз мадэлі правакатыўнай педагогікі). Напрыклад, праз памылкі адбываецца набыццё лірычным героем станоўчага досведу, а пастаноўка актуальных пытанняў замест адказаў на іх актывізуе ў дзяцей мысленчыя працэсы. Вядомым прыкладам літаратурнай рэалізацыі ідэй правакатыўнай педагогікі лічацца "Шкодныя парады" рускага пісьменніка Рыгора Остэра (выхаваўчая мэта дасягаецца шляхам высмейвання недарэчных сітуацый).

Беларускі паэт Анатоль Зэкаў, аўтар і былы літаратурны рэдактар часопіса "Вясёлка", актыўна выкарыстоўвае паэзію як сродак лінгвістычнага развіцця, фарміравання моўнай кампетэнцыі ў дзяцей. Яго вершы, прадстаўленыя ў названым выданні, выконваюць дыдактычную функцыю, спрашчаючы засваенне складаных правілаў беларускай мовы:

Цяжка правілы вучыць?
Вы з такіх не першыя!
Паспрабую вам дапамагчы
ПРАВІЛьнымі вершамі [2, с. 15].

Засвоіла выдатна Маша,
Калі чытала кніжку:
На мове беларускай нашай –
Як чуем, так і пішам [2, с. 15].

Перад націскам у першым складзе
Я замест Е, Ё выводзіць Надзя.
Піша: лес – лясны, а мёд – мядовы…
Вы запомніць правіла гатовы? [2, с. 15].

Праз зразумелыя вобразы і даходлівае выкладанне думак аўтар дапамагае дзецям лягчэй запомніць складаныя арфаграфічныя і граматычныя канструкцыі, ператвараючы вывучэнне мовы ў займальны працэс.

Вучэбна-прыкладныя вершы ў “Вясёлцы” гарманічна суіснуюць з творамі анталагічнага, філасофска-медытатыўнага і пейзажнага характару. Нягледзячы на адрозненне ў тэматыцы і стылістыцы, многія з іх змяшчаюць дыдактычны падтэкст, накіраваны на фарміраванне маральных арыенціраў у юных чытачоў. Так, верш Ніны Галіноўскай акцэнтуе ўвагу на неабходнасці ўсведамлення чалавечых каштоўнасцей: “– Ёсць ісціна спрадвеку, / Табе пара ўжо знаць: / Сапраўдным чалавекам / Павінен кожны стаць” [3, с. 21]. Расціслаў Бензярук у лаканічнай афарыстычнай форме падкрэслівае важнасць адказнасці за свае словы: “Словам, браце, даражы, / А сказаўшы – дакажы” [4, с. 14]. У сваю чаргу, верш Серафімы Беставай прывівае экалагічную свядомасць, вучыць клопату аб прыродзе: “З дрэва ягад не чапаем, / На зіму іх пакідаем. / Будзе птушачкам ласунак” [5, с. 2] і інш.

Кожны нумар часопіса “Вясёлка”, як і маладзейшага за яе на 44 гады выдання “Бусі”, змяшчае творы аўтараў-пачаткоўцаў. Рэдакцыя рэгулярна атрымлівае лісты ад дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі. Аўтарамі твораў з’яўляюцца школьнікі, якія робяць першыя крокі ў паэтычнай творчасці. Іх заахвочванне і падтрымка – важны напрамак работы рэдакцыі і адукацыйных устаноў. Асабліва з улікам таго, што дзіцячыя часопісы выкарыстоўваюцца педагогамі пачатковай школы як сродак стымулявання творчай актыўнасці і самастойнасці вучняў.

Часопісы для дзяцей “Дуду” і “Жэўжык” прыцягваюць увагу ўнікальнай канцэпцыяй, адаптаванай да сучасных патрэб юных спажыўцоў. Так, часопіс “Дуду”, арыентаваны на дашкольнікаў, збірае пад вокладкай простыя тэксты і маляўнічыя ілюстрацыі, таму ідэальна падыходзіць для ранняга ўзросту. Акрамя таго, выданне змяшчае гульнёвыя заданні на развіццё кагнітыўных навыкаў і фармірванне ў дзяцей цікавасці да друкаванага мастацкага слова.

“Жэўжык” – анлайн-часопіс, што адкрывае яго для шырокай аўдыторыі. Змест тут таксама разнастайны: літаратурныя творы, галаваломкі, калектыўныя заданні. Ініцыятыва бацькоў-энтузіястаў забяспечвае ўвагу да запытаў сучасных беларускіх сем’яў, арыентуючы часопіс на інтэрактыў і сумеснае чытанне.

Беларуская дзіцячая літаратура XXI ст., рухаючыся па шляху камерцыялізацыі, паступова выходзіць за межы традыцыйных эстэтычных і жанравых катэгорый, уласцівах класічнаму прыгожаму пісьменству. Гэтая тэндэнцыя адлюстроўваецца ў змесце і формах новых выданняў. Напрыклад, галоўным героем часопіса “Асцярожна: дзеці!” з’яўляецца Занадта Разумны Смартфон, які не толькі ўдзельнічае ў разгадванні дэтэктыўных гісторый, але і выступае інструментам пазнання навакольнага свету. Сучаснасць праяўляецца ў тэматыцы публікацый (“Асцярожна: вірус!”, “Усё пра дроны”, “Скарб у падзямеллі”, “Электрамабілі”, “Віртуальная рэальнасць” і інш.) і ў спосабах падачы матэрыялу. Праз QR-коды часопіс накіроўвае чытачоў да інтэрнэт-рэсурсаў з дадатковай інфармацыяй, спрыяючы інтэграцыі традыцыйнай літаратуры з лічбавымі тэхналогіямі.

Інтэрнэт становіцца важным інструментам для маладога аўтара: ад самапрэзентацыі і пошуку аўдыторыі да ўдзелу ў анлайн-конкурсах. Акрамя таго, дзякуючы адкрытай лічбавай прасторы аўтары могуць атрымаць рэцэнзіі на ўласныя творы ў выглядзе каментароў. Свабода словавыяўлення ў такім выпадку стварае маральна-этычную праблему, што з’яўляецца ўжо прадметам іншых даследаванняў.

Серыя “Жывая класіка – дзецям”, распачатая ў 2017 годзе па ініцыятыве Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, уяўляе сабой значны праект у галіне дзіцячай літаратуры і адукацыі. Яна створана з мэтай папулярызацыі класічных твораў беларускіх аўтараў сярод маладога пакалення, садзейнічае фарміраванню ў яго літаратурнага густу і патрыятызму. Абраныя для серыі творы дапамагаюць вучням глыбей усвядоміць гісторыка-культурную спадчыну Беларусі, спрыяюць чытацкай і маўленчай актыўнасці. У рамках згаданай ініцыятывы праводзіцца Рэспубліканскі конкурс юных чытальнікаў “Жывая класіка”.

Па звестках Белстата за 2020 год, мастацкая літаратура для дзяцей і падлеткаў склала 6,5 % ад агульнай колькасці выдадзеных у Беларусі кніг і брашур, што не на шмат менш за літаратурна-мастацкія выданні ў цэлым (7,1 %). З 346 друкаваных адзінак дзіцячай літаратуры 218 прыпала на прозу, 54 – на паэзію, 39 – розныя жанры, 33 – фальклор, 2 – драматургію. Доля часопісаў масавага прызначэння зафіксавана на ўзроўні 18,7 %, часопісы для шырокага кола чытачоў не перавысілі 11, 6 % [6].

Перыядычны друк працягвае заставацца значным каналам распаўсюджвання паэтычнага слова. Калі творчыя дасягненні прадстаўнікоў старэйшага пакалення літаратараў паддаюцца аналізу на аснове колькасці і якасці апублікаваных імі кніг, то для маладых аўтараў пошук аўдыторыі непазбежна звязаны з публікацыяй у перыядычных выданнях. Менавіта яны становяцца першым этапам іх літаратурнай кар'еры.

Інтэлектуальны часопіс для падлеткаў "Бярозка", у прыватнасці яго рубрыка "Заяўка на Парнас", адкрывае паэтаў-аматараў, даючы ім пляцоўку для рэалізацыі першых літаратурных спроб. "Ствараем разам творчую прастору!" – слоган, што актыўна прасоўваецца рэдакцыяй у інтэрнэце. Хэштэгам #Творчасцьчытачоў напрыканцы 2023 года бярозкаўцы запусцілі аднайменную рубрыку ў папулярнай сацсетцы. Першай "ластаўкай" стаў верш Марыі Бакуновіч "Горад жыве". Ён падкрэслівае дынаміку сучаснага гарадскога асяроддзя, рэзаніруючы з моладзевым разуменнем урбанізму: "Разрастаецца лесам каменным / І высаджвае кветкі са шкла. / Ўсё вышэй узнімаюцца сцены, / А за імі схавана душа" [7].

Маладая генерацыя творцаў звяртаецца да грамадзянскай лірыкі як спосабу рэфлексіі над глабальнымі і лакальнымі калізіямі, спалучаючы асабістыя перажыванні з калектыўным досведам. Такія творы яднаюць класічную рэцэпцыю грамадзянскай праблематыкі з актуальнымі сацыяльнымі выклікамі.

Мая Радзіма – гэта наша вёска
І хаты, што стаяць уздоўж дарог,
Лугі, палі і стройныя бярозкі –
Усё, што наш народ збярог [7, с. 20].

Радзіма для Дар'і Раманьковай (на момант публікацыі – дзевяцікласніцы мінскай гімназіі) – "песня жаўрука", "карагод Купальскі", "першы жніўны колас", "бульбяныя стравы", "ручнікі, абрусы" і, у рэшце, канстатуе юная паэтэса, Радзіма гэта – беларусы. Аксіялагічная шкала Дар'і апелюе да традыцыйных канстантаў, "выпеставаных" шматвяковай гісторыяй "зямлі пад белымі крыламі". Што, дарэчы, не з'яўляецца адзінкавым прыкладам.

Паводле апытання, праведзенага сярод чытачоў часопіса "Бярозка" ў маі 2024 года, найбольшую цікавасць выклікала гістарычная тэматыка, апярэдзіўшы экалагічную і спартыўную. Юныя аўтары шчыра прызнаваліся ў любові да сваіх бацькоў, надаючы асаблівую ўвагу тэме сям'і. Лірычныя героі іх твораў звярталіся да "матулі-мовы", выказваючы жаданне захаваць яе для будучых пакаленняў. Не абышлі ўвагай тэму міру, разважаючы пра

“мірнае неба” над Беларуссю. Услаўлялі подзвігі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівым водгукам душы стала памяць пра Хатынь: верш Анастасіі Шмальковай, вучаніцы Бараўлянскай школы, напісаны ў гонар 80-й гадавіны хатынскай трагедыі, перадаў балючае і важнае разуменне нацыянальнай гістарычнай памяці:

Хатынь – гэта памяць,
Каб нам не забыцца,
Што ў час старадаўні
Паспела адбыцца.
Каб ведалі,
Колькі каштуе свабода,
І каб не забыліся
Пра подзвіг народа [8, с. 20].

Творчасць беларускіх школьнікаў не абмяжоўваецца грамадзянскай лірыкай. У адпаведнасці з узростам дзеці ахвотна звяртаюцца да блізкіх і зразумелых ім тэм: святы, вакацыі, забавы, а таксама першае пачуццё кахання. Цікавяцца падлеткі і беларускай міфалогіяй. У вершах узнікаюць алюзіі на традыцыйныя вобразы і легенды (“Казка пра шчасце”, “Зюзя”, “Багіня хатняга агню”, “Лепельскі цмок”, “Вяселле сонца і месяца”, “Баба-Яга” і інш.), што, верагодна, часткова абумоўлена ўплывам школьнай праграмы і пазакласным чытаннем. Акрамя таго, “Бярозка” рэгулярна друкуе творы пераможцаў конкурсаў на лепшы мастацкі твор. Гэта таксама тлумачыць схільнасць дзяцей да “дарослых” і “змрочных” тэм.

Больш высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі маладых аўтараў знаходзіць адлюстраванне ў паэтычных публікацыях часопіса “Маладосць”, які збірае ў асноўным творы прадстаўнікоў розных гуманітарных дысцыплін – ад студэнтаў-філолагаў да навуковых даследчыкаў (Ірына Макарчук, Таццяна Курмазія, Кацярына Самусенка, Аляксандра Жалязнова, Андрэй Кімбар, Кацярына Янчэўская, Юлія Алейчанка, Марына Верабей і інш.). Кожны па-рознаму асэнсоўвае праблематыку жыцця, творчасці і самавыяўлення. Іх мастацкая рэфлексія спалучае актыўную жыццёвую пазіцыю з экзістэнцыйнымі пошукамі, максімалісцкімі афірмацыямі: “Рабі, што павінна, хай будзе, што будзе, / Няхай табе ў твар пасміхаюцца людзі” [9, с. 29]. Адны выказваюць скептыцызм адносна ўласнай маральнай трываласці: “Бракуе даверу / найперш да сябе” [10, с. 16], іншыя звяртаюцца да дапушчальнага ў мастацкім кантэксце перабольшання: “І на ўсё я, здаецца, гатова, / Каб паэзіі сэрца аддаць” [11, с. 26]. Менавіта гэтае перабольшанне

ў пэўны момант становіцца каталізатарам творчай свабоды, адкрываючы мастаку доступ да патаемнага свету мараў, дзе духоўнае "я" ўступае ў канфрантацыю з фізічным. У выніку гэтага ўзаемадзеяння і супрацьстаяння нараджаецца мастацкая ісціна:

> Складана адчуваць чалавечую слабасць
> і адчайна імкнуцца адужаць патокі вады.
> Ёсць веды, што трэба прайсці
> парогі абяздоленасці,
> скрозь дождж і разлівы рэк убачыць
> паварот да сябе – цішыні бязводнай ... [12, с. 23].

Анталагічныя матывы падштурхоўваюць творцаў да адкрыццяў – малых і вялікіх, прыватных, і агульназначных. А вось што іх саміх натхняе, можна даведацца ў рубрыках не паэтычных, аднак не менш цікавых, напрыклад, пра любімыя кнігі юнацтва.

У беларускай перыёдыцы для дзяцей і школьнікаў актыўна публікуюцца як аматары, так і прызнаныя майстры слова, чые творы служаць крыніцай натхнення для пачаткоўцаў. Дыдактычнага вектара трымаюцца аўтарытрадыцыяналісты Ніна Шклярава, Мікола Чарняўскі, Людміла Кебіч, Алесь Бадак, Віктар Шніп і інш. Практычная мудрасць – аснова іх светапогляду.

Часопіс "Полымя" займае асобнае месца ў сучасным літаратурным працэсе, захоўваючы статус аўтарытэтнага выдання з багатай гісторыяй. Дзякуючы прызнанню Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК), ён аб'ядноўвае на сваіх старонках творы паэтаў, празаікаў, даследчыкаў, спрыяючы міждысцыплінарнаму дыялогу і развіццю нацыянальнай літаратурнай думкі. Традыцыя пераемнасці, абраная беларускімі творцамі ля палымянскіх вытокаў стагоддзе таму, працягваецца і сёння. У паэтычным разнагалоссі "права на песню" набылі маладыя галасы Рагнеда Малахоўскага, Уладзіміра Чараухіна, Кацярыны Роўды, Ксеніі Шаржановіч і інш. Некаторыя аўтары зрабілі паэзію сваім прафесійным заняткам.

Часопіс – адносна кансерватыўны кангламерат з аформленай рэдакцыйнай палітыкай. У той час як газета – чуйнае да змен выданне, цярпімае да тых, хто яшчэ не зарэкамендаваў сябе ў паэтычным мастацтве. Дасягальным для айчыннага пісьменніка застаецца ЛіМ. Больш за 90 год газета запальвае зоркі на небасхіле літаратуры. Штотыдня выхоўвае чытачоў змястоўнымі рэцэнзіямі, цікавымі інтэрв'ю, анонсамі, рэпартажамі. Знаёміць з народнай творчасцю, рэалізуе нацыянальныя праекты. У фокусе

ЛіМа – вершы як ужо знаёмых пастаяннаму чытачу аўтараў, так і новых. Для апошніх важная вяха ў біяграфіі – дэбютныя публікацыі, і ЛіМ – выдатная пляцоўка, каб яе займець.

Спарадычнасць і аб'ём вершаваных нізак у перыядычным друку, вядома, не дае поўнай карціны сучаснага літаратурнага працэсу, але звяртае ўвагу на пэўныя тэндэнцыі, зрухі, важныя для літаратуразнаўчых даследаванняў і прагнозаў. Рубрыкі “Паэзія”, “Крытыка”, “Чытацкі дзённік” і інш. прадстаўляюць не толькі аўтарскае бачанне свету, але і прафесійны аналіз творчасці, што дазваляе ацаніць яе з розных перспектыў.

Дапамагаюць у самасцвярджэнні творцам літаратурныя конкурсы: прэмія імя А. Бачылы за лепшую паэтычную публікацыю – газета “Літаратура і мастацтва”, конкурс “БрамаМар” – часопіс “Маладосць”, міжнародны конкурс “Першацвет” – Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, выдавецтва “Мастацкая літаратура”, РВУ “Выдавецкі дом “Звязда” і інш. Часта іх кніжным увасабленнем становяцца калектыўныя зборнікі, а з часам – першыя кнігі паэтаў. Дапамагае гэтаму ў тым ліку дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, напрыклад, Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Такім чынам, паэзія ў сучасным перыядычны друку выконвае некалькі важных функцый. Як сродак выхавання падрастаючага пакалення акумулюе і ў дасціпнай паэтычнай форме перадае назапашаны досвед беларусаў. Яе дыдактычны патэнцыял выяўляецца ў непасрэдным навучанні, а таксама ў фарміраванні крытычнага мыслення, эстэтычнага густу. Публікацыя ў такога кшталту выданнях становіцца першым літаратурным крокам і разам з тым важнай падзеяй у кантэксце пераемнасці культурных традыцый, умацавання сувязі паміж рознымі творчымі генерацыямі.

Пытанне аб выхаваўчых мажлівасцях літаратуры тым больш актуальнае, чым часцей яно супрацьпастаўляецца патэнцыялу лічбавага стагоддзя. Барацьба за чытацкую ўвагу вызначыла ўзаемаадносіны паэзіі з іншымі відамі атрымання інфармацыі, у тым ліку праз інтэрнэт, але не адказала на пытанні, ці можа вопыт аўтара (у праватнасці, маладога) некага навучыць, наколькі пры гэтым важны аўтарытэт асобы, папулярызацыя твора, як ажыццяўляецца развіццё літаратуры ва ўмовах лічбавізацыі, якім шляхам праходзіць пачынаючы аўтар да сваёй першай кнігі і інш.

Аналіз перыёдыкі паказвае, што сучасная беларуская паэзія не толькі адаптуецца да лічбавых умоў, але і развіваецца дзякуючы ім. Папяровы перыядычны друк, транслюючы рэдакцыйную палітыку, захоўвае галоўнага цэнзара. Лічбавізацыя і арыентацыя на новыя медыя дазваляюць пашыраць аўдыторыю беларускай літаратуры. QR-коды, інтэрактыўныя заданні і сацыяльныя сеткі ствараюць дадатковыя магчымасці для папулярызацыі мастацкага слова сярод моладзі.

Беларуская паэзія XXI стагоддзя праходзіць дынамічны этап, калі важна захаваць нацыянальную адметнасць, не страціўшы цікавасці да пошуку новых форм самавыяўлення. Перыёдыка – гэта прастора творчага сталення, шлях ад аматарства да прафесіяналізму, шлях ад першага верша да першай кнігі паэта.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Макаренко, А.* Воспитание в семье / А. Макаренко. – Куйбышев : УЧПЕДГИЗ, 1955. – 320 с.
2. *Зэкаў, А.* Правільныя вершы / А. Зэкаў // Вясёлка. – 2021. – № 1. – С. 15.
3. *Галіноўская, Н.* Кім быць / Н. Галіноўская // Вясёлка. – 2020. – № 5. – С. 21.
4. *Бензярук, Р.* Пан і рака / Р. Бензярук // Вясёлка. – 2020. – № 6. – С.14.
5. *Бестава, С.* Пацеркі / С. Бестава // Вясёлка. – 2020. – № 8. – С. 2.
6. Статистический обзор ко Дню печати. – URL: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/publications/izdania/public_reviews/index_-41733/?sphrase_id=2061401 (дата звароту: 29.07.2024).
7. *Бакуновіч, М.* Горад жыве. – URL: https://www.instagram.com/p/CztDL0-aIAf3/?img_index=3 (дата звароту: 10.12.2024).
8. *Шмалькова, А.* Хатынь / А. Шмалькова // Бярозка. – 2023. – № 6. – С. 20.
9. *Макарчук, І.* Чакаю свайго вогнішча / І. Макарчук // Маладосць. – 2023. – № 6. – С. 29.
10. *Кімбар, А.* За дзень да чарговай вясны / А. Кімбар // Маладосць. – 2023. – № 4. – С. 16.
11. *Мізерыя, К.* Зорачка вядзе па свеце / К. Мізерыя // Маладосць. – 2023. – № 4. – С. 26.
12. *Янчэўская, К.* Судакрананне / К. Янчэўская // Маладосць. – 2023. – № 6. – С. 23.


*Поступила в редакцию 27.12.2024*